Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 29 (681) ● ПЯТНІЦА, 13 кастрычніка 1967 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XX

САРДЭЧНАЕ ПРЫВІТАННЕ ЎДЗЕЛЬНІКАМ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ НАВУКОВАЙ СТУДЭНЦКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ!

Учора ва універсітэце пачала сваю работу Рэспубліканская навуковая канферэнцыя па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ, міжнароднага маладзёжнага руху, прысвечаная 50-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. На пленарным пасяджэнні былі заслуханы даклады: «Грамадскія навукі і моладзь», «Асноўныя напрамкі распрацоўкі гісторыі Кампартыі Беларусі», «Актуальныя праблемы філасофскіх навук», «Эканамічныя навукі на сучасным этапе». У той жа дзень ва універсітэце і іншых вышэйшых навучальных установах Мінска працавалі секцыі гісторыі КПСС, навуковага камунізма, палітэканоміі, гісторыі ВЛКСМ і філасофіі.

Права ўдзельнічаць у гэтай высокай канферэнцыі заваявала сем студэнтаў нашага універсітэта. Яны падрыхтавалі змястоўныя і цікавыя паведамленні па актуальных праблемах. Сярод дакладчыкаў — Т. Глушакова («Камуністычны Інтэрнацыянал у барацьбе за адзінства рабочага класа»), Е. Сажнеў («Аб магчымасці некапіталістычнага шляху развіцця некаторых афрыканскіх краін»), М. Міранда («Кубінская сацыялістычная рэвалюцыя і моладзь»), В. Шалькезіч («Крытыка французскімі марксістамі экзістэнцыялізма») і іншыя. Студэнтка Л. Колабава падрыхтавала работу аб удзеле камсамола Беларусі ў барацьбе за выкананне плана першай пяцігодкі, а Л. Ніціеўская прысвяціла сваё выступленне такой важнай праблеме, як «Капіталістычная эксплуатацыя» і рабочая моладзь».

У рабоце канферэнцыі прымаюць удзел вядучыя вучоныя, прадстаўнікі ЦК камсамола Беларусі і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

РАШЭННІ ЦК КПСС — У ЖЫЦЦЁ

Адбыўся агульнаўніверсітэцкі партыйны сход, на якім былі абмеркаваны задачы партарганізацыі па выкананню Пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым развіцці грамадскіх навук і павышэнні іх ролі ў камуністычным будаўніцтве». З дакладам па гэтаму пытанню выступіў член парткома прафесар М. І. Лушчыцкі.

Справаздача са сходу будзе змешчана ў наступным нумары газеты.

ЗАЎТРА — СВЯТА

У нашым універсітэце многа выдатных традыцый. Варта адзначыць, што амаль усе яны нарадзіліся па ініцыятыве камсамольцаў, якія імкнуцца зрабіць студэнцкае жыццё больш цікавым, змястоўным, поўным радасці і хвалюючых падзей. Народжаныя новыя студэнцкія традыцыі не толькі захоўваюцца ва універсітэце, але і памнажаюцца, разнастайваюцца і пераходзяць у скарбонку шматлікіх сродкаў выхаваўчай работы.

А вось гэтае студэнцкае свята нарадзілася зусім нядаўна. Называецца яно крыху рамантычна і ўзнёсла — «Пасвячэнне ў студэнты». Кожны год па-свойму цікава і незабыўна адзначаюць яго не толькі першакурснікі, але і іх старэйшыя таварышы. Песні, танцы, сяброўскія поціскі рук, віншаванні і галоўнае — сардэчнае знаёмства і дружба студэнтаў розных факультэтаў.

Заўтрашняе свята «пасвячэння ў студэнты» будзе асабліва ўрачыстым, і гэта не дзіўна: студэнтам - першакурснікам выпала зайздроснае шчасце — паступіць ва універсітэт у юбілейным годзе Савецкай улады.

Як яно пройдзе, хто будзе названы каралём і каралевай «Пасвячэння ў студэнты», мы раскажам вам у наступным нумары нашай газеты.

Б. КІСЕЛЬ.

КАСТРЫЧНІЦКІЯ БУДНІ КАФЕДРЫ

Наш карэспандэнт звярнуўся да загадчыка кафедры біяхіміі і біяфізікі біялагічнага факультэта дацэнта Анатоля Цімафеевіча Пікулева з некаторымі пытаннямі адносна таго, як кафедра рыхтуецца да 50-годдзя Савецкай улады.

У гутарцы Анатоль Цімафеевіч расказаў аб буднях кафедры ў гэтыя перадсвяточныя дні.

□ □ □

За чатыры гады свайго існавання кафедра біяхіміі і біяфізікі дасягнула вялікіх творчых поспехаў у навуцы. Яна налічвае ў сваім складзе двух прафесараў, дацэнта, двух кандыдатаў навук. Хутка будзе абаронена яшчэ адна кандыдацкая дысертацыя.

Кафедра ўносіць вялікі ўклад у агульныя дасягненні біялагічнага факультэта ў гонар 50-годдзя Савецкай улады.

Аспіранты, якія працуюць у якасці асістэнтаў на кафедры, атрымліваюць тут добрую падрыхтоўку і паспяхова абараняюць кандыдацкія дысертацыі. Так, у апошні час абаранілiся былыя аспіранты І. Савацееў, У. Бобр, Р. Мухарава. Іх дысертацыі былі накіраваны на вывучэнне ўплыву фізічных фактараў на працэсы дыхання. Цяпер рыхтуе кандыдацкую дысертацыю Л. Шэлушкова.

Нядаўна праходзіла канферэнцыя радыёбіёлагаў універсітэта і інстытута біялогіі. Да кастрычніцкага свята будзе апублікавана манаграфія па матэрыялах, якія абмяркоўваліся на гэтай канферэнцыі.

Трэба адзначыць, што пад кіраўніцтвам членаў кафедры шырока разгорнута навуковая дзейнасць студэнтаў. Апошнія прадставілі сем навуковых прац па біяфізіцы (П. Карака), біяхіміі (А. Васкабоеў, С. Врубель, Т. Касцюковіч) і іншых навуках.

Старшакурснікі, якія рыхтуюць дыпломныя работы, таксама атрымліваюць нямала карысных парад ад сваіх выкладчыкаў. Вынік гэтай працы сведчыць аб тым, што амаль кожная другая дыпломная работа публікуецца. Усяго за апошнія чатыры гады надрукавана 36 студэнцкіх работ.

Гордасцю кафедры і факультэта з'яўляюцца член-карэспандэнт АН БССР прафесар А. А. Шлык, прафесар Л. С. Чэркасава — удзельнікі VII міжнароднага навуковага біяхімічнага кангрэсу, які праходзіў у японскай сталіцы горадзе Токіо. Яны за час сваёй шматгадовай дзейнасці выхавалі многа вучоных, унеслі вялікі ўклад у развіццё біяхіміі. Сам Анатоль Цімафеевіч прымаў удзел у рабоце канферэнцыі параўнальнай эндакрыналогіі.

Загадчык кафедры біяхіміі і біяфізікі вельмі цёпла адгукнуўся аб яе супрацоўніках, якія ўсе свае поспехі пырсвячаюць Вялікаму Кастрычніку.

А. ЦЕРАХОВІЧ.



Калектыў нашага універсітэта з вялікай цяплынёй адзначыў нядаўна 75-гадовы юбілей старэйшага камуніста, члена КПСС з студзеня 1917 года, заслужанага ўрача БССР, актыўнага ўдзельніка лютаўскай і Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў выкладчыка БДУ І. А. Кажанкова.

Партыя і ўрад высока адзначылі яго працу. Ён узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайны, ордэнам Чывонай Звязды, мае 20 ганаровых грамат. І. А. Кажанкоў — выдатнік аховы здароўя СССР, ганаровы грамадзянін горада Дзямідава Смаленскай вобласці.

Наз дымку: І. А. Кажанкоў гутарыць з студэнтамі універсітэта.

Фота С. СУПРУНА.

З Кастрычнікам звяраючы крокі

ПАРТЫІ ДЗЯКУЮ

З вялікай радасцю я даведалася аб трэцяй сесіі Вярхоўнага Савета СССР сёмага склікання, дзе абмяркоўваўся Дзяржаўны план развіцця народнай гаспадаркі нашай краіны на 1968 год, Дзяржаўны бюджэт і іншыя важныя пытанні.

Сесія гэтая праходзіць у знамянальныя дні. Толькі што адбыўся вераснёўскі Пленум ЦК КПСС, які разгледзеў пытанні аб далейшым павышэнні дабрабыту савецкіх людзей.

Мы вельмі ўдзячны нашай партыі і ўраду за клопаты, якія накіраваны на ажыццяўленне светлай мары — пабудовы камунізма. Кожны з нас выказвае свае шчырыя пачуцці словамі: «Мы яшчэ больш будзем любіць цябе, Партыя. Ты ў нашых сэрцах назаўсёды! Адкажам на твае клопаты яшчэ лепшай вучобай, дасягнем яшчэ большых поспехаў. А для гэтага ў нас ёсць усе магчымасці».

А. КРАПІЛІНА,
студэнтка.

НЯСУ ЭСТАФЕТУ Ў 50 ГОД

Часта я задумваюся на тым, які цяжкі і складаны шлях прайшоў наш народ за 50 год існавання Савецкай улады. Ці змагла б якая-небудзь іншая краіна пераадолець усе цяжкасці і дабіцца такіх вялікіх поспехаў, якіх дабіўся СССР? Часта я пытаю сябе: а што я сам зрабіў для ўмацавання сваёй Радзімы, ці апраўдаў я тое давер'е, якое ўсклала на мяне партыя? І мне заўсёды здаецца, што перад Радзімай я ў вялікім даўгу, я не маю права спыняцца на дасягнутым, на сваіх скромных поспехах. Можа я і залішне крытыкую сябе, але добра ведаю, што гэтая крытычнасць мне дапамагае дабівацца яшчэ большага.

Я — сведка слаўнага юбілею Савецкай улады. Для мяне гэта вялікая радасць.

М. КАЗАЧЭНКА.

ЭКАНАМІСТЫ РЫХТУЮЦЦА ДА ЮБІЛЕЮ

Амаль паўтара месяца прайшло з таго часу, калі мы, студэнты першага курса аддзялення палітэканоміі юрыдычнага факультэта, увайшлі ў прасторныя, светлыя аўдыторыі універсітэта. Хваляванням, здавалася, не было межаў.

І вось — першыя заняткі. Добра мы яшчэ не ведаем адзін аднаго. Але з цягам часу ў нас нараджаецца моцная дружба. Усе мы, 26 юнакоў і дзяўчат, — сябры, адна сям'я. Нядаўна мы правялі сход, дзе гаварылі аб тым, як лепш арганізаваць грамадскую работу на аддзяленні. Выбралі камсорга, прафорга, культорга. Актывісты з першых дзён узяліся за справу. Яны арганізавалі экскурсію ў Домузей І з'езда РСДРП. Цяпер рыхтуемся наведаць музеі Айчыннай вайны і мастацкі. Акрамя гэтага, нас цікавяць і пытанні міжнароднага жыцця. Палітінфармацыі ў групах у нас сталі звычайнай з'явай. Вось і нядаўна наша студэнтка Люда Яравая выступіла з цікавай гутаркай аб міжнародным становішчы.

Цяпер у нас у разгары семінарскія заняткі па спецыяльных і грамадскіх дысцыплінах. З вялікай ахвотай мы рыхтуемся да практычных заняткаў па гісторыі народнай гаспадаркі, якія праводзіць В. К. Дашкевіч. Сярод нас ужо вызначыліся найбольш старанныя. Гэта —Н. Абрамава, Л. Давідзенка, І. Рабіновіч, Н. Ігоніна. Свае поспехі ў вучобе мы прысвячаем вялікаму святу — 50-годдзю Савецкай улады. Да гэтага ж свята мы рыхтуем свой канцэрт мастацкай самадзейнасці.

Адным словам, наша студэнцкае жыццё ва універсітэце пачалося цікава і змястоўна.

І. НАУМЧЫК,
камсорг І курса аддзялення палітэканоміі.



Перад намі, нібы жывы, паўстае дарагі ўсяму чалавецтву вобраз правадыра народаў свету Уладзіміра Ільіча Леніна. З яго імем звязана ўтварэнне бальшавіцкай партыі, перамога Кастрычніка, пабудова сацыялізма і магутныя крокі народаў да камунізма. Правадыр прадбачыў гэтыя шчаслівыя дні, у якіх мы жывем зараз. І ўзмах рукі Ільіча, здаецца, паказвае нам шляхі ў будучыню, кліча на вялікія здзяйсненні ў імя шчаслівага заўтра.

Фота А. Кадзета.

Справаздачы і выбары у партыйных арганізацыях

БАГАТЫ ЎРАДЖАЙ У ФІЛОЛАГАЎ

Партыйныя арганізацыі універсітэта робяць падлік сваёй гадавой працы, адзначаюць поспехі і крытыкуюць недахопы. Але галоўнае тое, што ўсе партыйныя справаздачна - выбарчыя сходы праходзяць пад сцягам старанней падрыхтоўкі камуністаў БДУ да 50-годдзя Савецкай улады, 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, правядзення ў жыццё рашэнняў партыі і ўрада. Менавіта гэтыя ключавыя пытанні сённяшняга дня і стварылі на аб'яднаным справаздачна-выбарчым сходзе камуністаў факультэта журналістыкі і філфака атмасферу вялікай увагі да даклада сакратара партбюро С. А. Гусака.

Камуністы журфака і філфака ў ідэйна-выхаваўчай рабоце сярод студэнцтва абапіраліся на багатыя рэвалюцыйныя традыцыі народа. На адным з пасяджэнняў партбюро было вынесена рашэнне аб ўсямерным выкарыстанні ў лекцыях, асабліва па грамадскіх навуках, матэрыялаў мінулага і цяперашняга нашай краіны. Была адобрана на партбюро і прапанова аб выкарыстанні ў лекцыйных курсах даследаванняў, якія выйшлі ў юбілейным годзе Кастрычніка, або прысвечаны гэтай падзеі. Аднагалосае адабрэнне вышэй выказаных прапаноў прафесарска-выкладчыцкім саставам факультэтаў дало плённы штуршок для больш шырокага вывучэння студэнтамі-філолагамі і журналістамі вялікіх змен, якія адбыліся за гады Савецкай улады.

Пад сцягам падрыхтоўкі да 50-годдзя Кастрычніка на філалагічным факультэце быў праведзены сімпозіум славістаў, дзе былі пасланцы з Масквы, Ленінграда, Кіева, Вільнюса, Алма-Аты, Львова, Самарканда і іншых гарадоў краіны. Неўзабаве ў гонар свята адбудзецца яшчэ адзін сімпозіум славістаў на тэму: «Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і беларусазнаўства». Прыклад па дастойнай сустрэчы юбілею паказвае камісія па стварэнню выстаўкі гісторыі факультэта. У склад яе ўваходзяць камуністы М. Жыдовіч, А. Кадзет, С. Супрун і іншыя.

Выдатны падарунак 50-годдзю падрыхтавалі члены літаратурнага аб'яднання «Узлёт». Напярэдадні свята выйдзе ў свет зборнік вершаў «Натхненне». Плённа папрацаваў у юбілейным годзе і кіраўнік аб'яднання паэт-камуніст Алег Лойка. Яго манаграфія аб Максіму Багдановічу пісьменнікамі БССР прызнана адной з лепшых за апошнія гады.

Радуюць поспехі і навукова-даследчай работы студэнтаў. Абавязацельствы, узятыя членамі СНТ да юбілею, выкананы. На рэспубліканскі агляд было прадстаўлена 40 навуковых прац. З іх Дыпломы I і II ступені атрымала 14, а астатнія адзначаны Дыпломамі III ступені.

Вялікая работа была праведзена камуністамі па прапагандзе ідэй Кастрычніка сярод рабочых заводаў, фабрык, саўгасаў і іншых падшэфных арганізацый. На працягу года было прачытана 150 лекцый і дакладаў. Заслугоўвае адабрэння і такое мерапрыемства партбюро, як стварэнне на курсах агітацыйных брыгад, якія сумесна з калектывам мастацкай самадзейнасці факультэта зрабілі многа выязда ў на Мінскі і Беларускі аўтамабільныя заводы, у вайсковыя падраздзяленні і многія саўгасы і калгасы.

Выступіўшыя ў спрэчках камуністы тт. Садоўнікаў, Аляшкевіч, Булацкі, Зярніцкі, Волк і іншыя выказалі задавальненне работай партыйнага бюро і яго сакратара С. Гусака, прапанавалі яшчэ лепш кантраляваць вучэбны працэс.

Дэкан журфака правільна адзначыў, напрыклад, што журналістам для чытання лекцый па грамадскіх дысцыплінах рэктаратам павінны выдзяляцца выкладчыкі, якія працавалі ў газетах.

Пасля ў сувязі са стварэннем у гэтым годзе факультэта журналістыкі былі адабраны два партбюро журфака і філфака.

П. ГЛЕБКА.

АКТУАЛЬНАЯ РАЗМОВА

У самых старэйшых студэнтаў факультэта журналістыкі — чацвёртакурснікаў адбыўся справаздачна-выбарчы партыйны сход. На ім прысутнічалі не толькі студэнты-камуністы, але і куратар курса, выкладчык рускай савецкай літаратуры С. А. Лысенка, член партбюро В. М. Цімафеева.

З дакладам выступіў партгрупорг Анатоль Гарбачоў. Галоўнае пытанне, на якое ён звярнуў увагу — гэта паспяховасць камуністаў групы ў бягучым навучальным годзе. З 11 членаў КПСС пераважная колькасць здала летнюю сесію на «добра» і «выдатна». Маюцца дзве нездавальняючыя адзнакі. Наогул, А. Гарбачоў падкрэсліў, што поспехі ў вучобе зараз на курсе горшыя, чым тыя, якія былі ў іх на першым і другіх курсах. Недахопам быў дан аналіз і выказаны шляхі іх выкаранення.

Хутка прыйдзе час, калі студэнты-журналісты закончаць вучобу, здадуць залікі і экзамены. Наперадзе ў іх застанецца праддыпломная практыка. Таму вельмі актуальнай была размова аб рабоце над дыпломнымі.

У спрэчках было выказана шмат важных прапаноў.

Камуністы аднагалосна зноў абралі А. Гарбачова партгрупоргам.

ВАЧЫМА СЯБРОЎ

ПОЕЗД вёз нас на вучобу ў СССР. Па дарозе мы бачылі неабсяжныя стэпы, высокія горы, зялёныя лясы, бяскрайнія нівы, вялікія будоўлі, заводы, фабрыкі. І ўсё гэта свеціцца ў яркім электрычным святле. Такое першае і, відаць, незабыўнае маё ўражанне аб краіне Вялікага Кастрычніка.

Савецкі народ пабудаваў сацыялістычнае грамадства, разграміў сваіх ворагаў, натхнёна і ўпэўнена будуе камунізм — светлую мару ўсяго чалавецтва.

Мы ўсюды адчувалі гасціннасць савецкіх людзей, дзе толькі не прыходзілася нам бываць. Яшчэ ў час сустрэчы ў Маскве і Мінску мы адчулі тое адзінства, цеплыню адносін, якія існуюць паміж нашымі народамі.

Нам вядома, што многія савецкія юнакі і дзяўчаты гатовы, як толькі гэта будзе патрэбна, паехаць у В'етнам, каб прыняць непасрэдны ўдзел у барацьбе з амерыканскімі агрэсарамі, што савецкія людзі даюць кроў, каб выратаваць жыццё нашых мужных воінаў.

З думкай аб сваёй Радзіме, якая працуе, змагаецца на фронце, аб дапамозе савецкага народа і народаў братніх краін мы будзем вучыцца, каб стаць добрымі спецыялістамі і зрабіць нашу краіну таксама прыгожай і заможнай.

Вун Тань АНЬ.

Сонечным быў той дзень, калі мы прыйшлі ў Батанічны сад. Мы любаваліся кветнікамі, маладымі дрэўцамі самых розных парод...

Мінск быў разбураны вайной, але цяпер адноўлены. Мне прыпомніўся Ханой, які штодзень рыхтуе новыя магілы для амерыканскіх самалётаў. Каб не ішла вайна, ён быў бы таксама такім жа прыгожым горадам, як Мінск. Аб мінулым беларускай сталіцы нам расказалі кінакадры.

Дзве нядзелі назад быў я ў дзіцячым садзе № 125. Бачыў, як гадуюцца тут дзеці — радасць і надзея іх бацькоў. Маё сэрца сціснулася ад болю, калі я падумаў, што на маёй Радзіме амерыканскія агрэсары забіваюць нашых дзяцей бомбамі, травяць хімічным ядам...

Я шмат ужо даведаўся пра Мінск, палюбіў гэты цудоўны горад. І сярод мінчан у нас ёсць многа сяброў.

К'еу Хак Туан,
студэнт падрыхтоўчага факультэта.

Мінуў месяц з таго часу, калі першая група в'етнамскіх студэнтаў прыехала ў наш ардэнаносны універсітэт на вучобу. Юнакоў і дзяўчат з братняй краіны савецкія людзі акружылі шчырасцю і цеплынёй. Выкладчыкі і студэнты паўсядзённа аказваюць ім братнюю дапамогу ў вучобе.

Наш пазаштатны карэспандэнт У. Галайша звярнуўся да в'етнамскіх студэнтаў з просьбай выказаць свае першыя ўражанні аб краіне Вялікага Кастрычніка.

УПАЧАТКУ некаторыя з нас не жадалі ехаць на вучобу за мяжу, таму што збіраліся ўступаць у рады абаронцаў Радзімы. Але добра памеркаваўшы, вырашылі, што вучыцца прафесіі — гэта таксама адказная задача. Пасля перамогі спатрэбяцца самыя розныя спецыялісты: інжынеры, ўрачы, аграномы і многія іншыя. І тады мы дапаможам краіне, народу будаваць новае жыццё.

Па дарозе ў СССР мы шмат думалі пра сваю родную Радзіму, аб сябрах, знаёмых, таварышах. Мы хваляваліся і ад таго, што многія з нас не ведалі рускай мовы. Якія цяжкасці чакаюць нас, як пойдзе вучоба?

Але вось мы жывем у Мінску ўжо больш месяца. Крыху пазнаёміліся з жыццём савецкіх людзей. Для нас Мінск — малады, прыгожы і дарагі горад, і адчуваем мы сябе тут, як дома.

Мы ўпэўнены, што праз шэсць год станем высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Скончыўшы вышэйшую навучальную ўстанову, паедзем назад, дамоў, але мы ніколі не забудзем краіну Вялікага Кастрычніка.

Чан тхі Мінь Дань,
студэнтка падрыхтоўчага факультэта.

Павагай і аўтарытэтам сярод сябровак карыстаецца студэнтка другога курса філалагічнага факультэта Ларыса Балашова. Яна стараклна вучыцца і выконвае вялікую грамадскую работу. Любімае хобі Ларысы—мастацкая самадзейнасць. Яна ўсюды хоча паспець, як мага больш карысці зрабіць для таварышаў. Вось і на здымку нашага фотакарэспандэнта А. Кадзета вы бачыце яе задумёнай, акружанай хараством дзявочых мар.

ЗАПРАШАЕ

Агульная мова. Гэтыя словы ўсё часцей і часцей можна пачуць з вуснаў многіх лінгвістаў свету. Сотні вучоных працуюць над праблемамі, гіпотэзамі і тэорыямі агульначалавечай мовы. Гэтыя праблемы ўсё істотней даюць сябе адчуваць у апошнія дзесяцігоддзі, калі ўсё больш пашыраюцца культурныя і эканамічныя сувязі самых розных і самых далёкіх краін свету. Першым крокам у ажыццяўленні гэтай праблемы з'яўляюцца вывучэнне і далейшая распаўсюджванне эсперанто — міжнароднай мовы, гутарку на якой ужо практыкуюць многія замежныя турысты, асабліва студэнты. Іменна студэнтам, самым дапытлівым і самым дасціпным людзям, хочацца ведаць эсперанто таму, што, мабыць, ніхто так не жадае пабываць у далёкіх краінах, пабачыць многа новага і цікавага, як яны. Не выпадкова, што ў

КЛУБ

Апошні час ў шматлікіх гарадах нашай краіны ўсё шырэй распаўсюджваюцца курсы па вывучэнню міжнароднай мовы.

У гэтым годзе завочныя курсы па вывучэнню эсперанто арганізаваў і клуб «Амікецо» пры Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце замежных моў. Завочны курс эсперанто прадугледжвае выкананне 15 кантрольных работ на працягу шасці з паловай месяцаў. Пасля гэтага — праверачнае субяседаванне, якое дасць магчымасць выявіць, у якой ступені студэнт засвоіў

«АМІКЕЦО»

праграмны мінімум.

Па заканчэнню курса эсперанцістам будуць уручаны спецыяльныя значкі.

Жадаючыя займацца на завочных курсах павінны падаваць заявы на імя старшыні клуба і заплаціць 5 рублёў (гэтая сума ўключае гадавую падпіску на часопіс «Сучасная Балгарыя» на мове эсперанто, з якога будуць выкарыстаны тэксты для кантрольных работ, кошт значка і затраты на падрыхтоўку кантрольных работ).

Заявы прымаюцца ў аудыторыі № 520 будынка «А» інстытута замежных моў з 19 гадзін да 19.30.

А. КРЭПІЧ.

У юбілейным годзе ў нашым ардэнаносным універсітэце створан яшчэ адзін факультэт — журналістыкі. Дэканам яго зацверджан кандыдат гістарычных навук дацэнт Р. В. Булацкі. Ніжэй друкуецца яго артыкул, які быў змешчан у «Советской Белоруссии».

ЦЯЖКІ СТАРТ ФАКУЛЬТЭТА

У 1944 годзе ў Беларускім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна быў створан факультэт журналістыкі, ператвораны пазней у аддзяленне філалагічнага факультэта. За дваццаць з лішнім год універсітэт падрыхтаваў на дзённым аддзяленні 589 і на завочным каля 500 высокакваліфікаваных работнікаў друку.

Выкладчыкі нашых кафедр гісторыі журналістыкі, тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку набылі некаторы вопыт у падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў, асабліва для рэдакцый газет і часопісаў. Да чытання асноўных курсаў і правядзення практычных заняткаў, кіраўніцтва курсавымі і дыпломнымі работамі прыцягваліся таксама супрацоўнікі газет, радыё і тэлебачання. У сярэднім у рабоце факультэта ўдзельнічае штогод звыш 20 практычных работнікаў друку.

Паралельна з выкладчыцкай працай педагогі факультэта распрацоўваюць пытанні гісторыі, тэорыі і практыкі друку і публіцыстыкі. Кафедрамі выданы калектыўныя працы «З гісторыі партыйна-савецкага друку Беларусі», працы М. С. Зярніцкага «Газета «Звязда» у барацьбе за перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі» і «Беларускі савецкі друк у гады замежнай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны», М. Я. Цікоцкага «З гісторыі беларускай журналістыкі» і «Практычная стылістыка беларускай мовы» і іншыя, якія з'яўляюцца выдатнымі дапаможнікамі для студэнтаў — журналістаў.

І ўсё ж нас не пакідае пачуццё незадаволенасці, думка аб тым, што кадры журналістаў трэба рыхтаваць лепш, даваць ім больш глыбокія і разнабаковыя веды, у крайнім выпадку па грамадскіх і шэрагу спецыяльных дысцыплін. І справа тут зусім не ў нашых недаробках, хоць і яны, відаць, маюць месца, а ў тым, што сучасны ўзровень савецкага друку прад'яўляе новыя, больш высокія патрабаванні да журналісцкай адукацыі. Аб гэтым сведчыць, у прыватнасці, выступленне і дыскусія аб падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў на старонках многіх газет і часопісаў, у тым ліку «Правды», «Советской печати» (цяпер «Журналист»), «Нового мира», «Литературной газеты». Падрабязна абмяркоўваліся гэтыя пытанні на VI пленуме праўлення Саюза журналістаў СССР, затым на II з'ездзе журналістаў СССР, у маі гэтага года — на нарадзе вну ў Маскве, на многіх навуковых канферэнцыях, прысвечаных тэорыі, практыцы і гісторыі партыйна-савецкага друку.

З мэтай павышэння якасці журналісцкай адукацыі ва універсітэце ў гэтым навучальным годзе зноў створан факультэт журналістыкі. Цяпер на ім займаецца каля 800 чалавек. Мы, педагогі факультэта, робім усё, каб ліквідаваць недахопы, якія маюцца ў падрыхтоўцы работнікаў друку. Журналіст жа — гэта спецыяліст асаблівага роду. Гэта перш за ўсё актыўны змагар за выкананне партыйных рашэнняў. Ён павінен быць палітычна адукаваным чалавекам, які глыбока ведае законы грамадскага развіцця. Ён павінен валодаць навуковай дакладнасцю мыслення, аб'ектыўнасцю аналізу фактаў.

Вядомы кінарэжысёр Сяргей Герасімаў, пастаноўшчык фільма «Журналіст» (адзначанага Вялікім прызам на Маскоўскім міжнародным кінафестывалі), падцвярджае: «Першакласны журналіст абавязаны валодаць вострай знаходлівасцю, уменнем бачыць другі і трэці план з'явы, глыбінёй псіхалагічнага аналізу, жывасцю ўяўлення, жаднасцю да факта ў яго канкрэтнай непаўторнасці, як мага больш шырокім асведамленнем у самых разнастайных сферах жыцця. Само імкненне да пазнання складае тэмперамент прафесіі, яе пачатак, яе аснову. Ён павінен быць ветлівым, здольным «разгаварыць» чалавека ў пачатку любога інтэрв'ю. Справа тут не толькі ў тым, каб атрымаць сухія факты, а больш за ўсё, відавочна, у тым, каб улавіць сутнасць субяседніка: яго характар, манеру думаць і выказваць суджэнні, асаблівасці яго слоўніка, інакш кажучы, узяць ад субяседніка сутнасць яго непаўторнасці. Для гэтага самому трэба быць цікавым і непаўторным».

Менавіта такімі журналістамі мы хочам бачыць нашых выпускнікоў і прыкладваем усе намаганні для таго, каб дапамагчы ім стаць такімі. На жаль, не ўсё залежыць ад выкладчыцкага саставу. Увядзенне ў свой час чатырохгадовага тэрміну навучання не змагло не адбіцца на ўзроўні журналісцкай адукацыі. Не далі карысці і частая змена вучэбных планаў, зніжэнне запатрабаванняў да агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі і прафесіянальных схільнасцей паступаючых на факультэт. У цяперашні час на факультэце зноў уведзены пяцігадовы тэрмін навучання, значна павышаюцца патрабаванні да агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі студэнтаў.

Многае ў падрыхтоўцы журналістаў залежыць ад высокакваліфікаваных выкладчыкаў. Нажаль, на нашым факультэце няма ніводнага доктара навук, прафесара, а 50 працэнтаў выкладчыцкага саставу не маюць вучоных ступеней і званняў. Між тым, нягледзячы на нашы шматлікія просьбы, планіруючыя органы з году ў год не даюць нам на стацыянарнае навучанне ў аспірантуру ніводнага месца. Не дзіўна таму, што за апошні час па журналістыцы абаронена адна доктарская і дзве кандыдацкія дысертацыі. І ўсё без адрыва ад асноўнай працы.

Павышэнню прафесіянальнай падрыхтоўкі будучых журналістаў павінна садзейнічаць паглыбленае вывучэнне грамадскіх навук, у тым ліку методыкі сацыялагічных даследаванняў, сацыялогіі, псіхалогіі. Таму вельмі важна, каб для выкладання філасофіі, дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму, гісторыі КПСС, палітэканоміі на факультэце вылучаліся найбольш вопытныя выкладчыкі.

Да цяперашняга часу недастатковая эканамічная падрыхтоўка нашых студэнтаў-журналістаў з-за адсутнасці кваліфікаваных выкладчыкаў эканомікі прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

Для таго, каб укамплектаваць зноў створаную кафедру тэорыі і практыкі радыё і тэлебачання, неабходна, каб міністэрства дазволіла працаваць па сумяшчэнню найбольш вопытным практычным работнікам.

Такім чынам, праблема навукова-педагагічных кадраў (а менавіта яны і вырашаюць поспех падрыхтоўкі журналістаў) патрабуе самай неадкладнай дапамогі рэктарата універсітэта і міністэрства.

Маюцца і іншыя пытанні, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння. Так, неабходна, на наш погляд, стварыць на факультэце кафедру літаратурнага рэдагавання і стылістыкі. Пытанне вывучэння моў у нас таксама адно з актуальных. Многія студэнты зусім не валодаюць беларускай мовай. Вядома, дабіцца грунтоўных ведаў па гэтаму прадмету — цяжкая справа, паспяхова выканаць якую не заўсёды ўдаецца.

У той жа час, як зусім правільна адзначалася на апошняй нарадзе вну краіны ў Маскве, у праграмах па сучаснай рускай мове (а ў нашым універсітэце — па сучаснай беларускай мове) маецца матэрыял, які не мае істотнага значэння для журналісцкай адукацыі. Напрыклад, калі для студэнта-філолага, будучага выкладчыка сярэдняй школы, аднолькава раўназначны пытанні фаналогіі, арфаэпіі, то для студэнта-журналіста першы з названых раздзелаў мае другараднае значэнне. Затое ўзмацняецца роля звестак па нарматыўнай фанетыцы і арфаэпіі. Ці яшчэ. Студэнту-філолагу неабходна ўмець дакладна разбірацца ў класіфікацыі даданых сказаў — бо гэта ўзбройвае яго тэарэтычнымі ведамі па прадмету, які ён пасля будзе выкладаць. А для студэнта-журналіста важней выясненне стылістычнай розніцы паміж разнавіднасцямі складаных сказаў, стылістычнай функцыі канструктыўных элементаў сінтаксіса.

Наяўнасць у вучэбным плане факультэта журналістыкі такіх двух курсаў, як сучасная беларуская мова і практычная стылістыка, дазваляе свабодней манеўраваць пры размеркаванні матэрыялу паміж імі. Прадстаўляецца магчымым і мэтазгодным вывучэнне моў будучымі журналістамі, спалучаючы са стылістычнымі характарыстыкамі той ці іншай моўнай з'явы з указаннем сфер яе выкарыстання. Студэнт-журналіст павінен вывучаць не толькі мову як сістэму, але і вымаўленне як практычную рэалізацыю гэтай сістэмы. Адсюль вынік: каб лепш падрыхтаваць журналістаў па рускай і беларускай мовах, трэба стварыць кафедру літаратурнага рэдагавання і стылістыкі, якая будзе кіраваць вучэбным працэсам па рускай, беларускай мовах, літаратурнаму рэдагаванню і стылістыцы з улікам спецыфічных патрабаванняў факультэта.

Ахілесавай пятой у падрыхтоўцы журналістаў у нашым універсітэце з'яўляецца адсутнасць належнай матэрыяльнай базы. У друку, на радыё, на тэлебачанні адбываецца працэс імклівага развіцця, на які аказвае ўплыў навукова-тэхнічная рэвалюцыя. Сучасны радыё- і тэлежурналіст павінен ведаць навейшую тэхніку.

Аднак на факультэце няма ніводнай адпаведнай лабараторыі, няма і спецыяльных кабінетаў. Зусім адсутнічае тэхнічнае забеспячэнне вучэбнага працэсу. Для таго, каб стварыць матэрыяльна-тэхнічную базу, неабходны асігнаванні. Іх, думаецца, павінна выдзяліць Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, Камітэт па радыёвяшчанню і тэлебачанню пры Савеце Міністраў БССР і Камітэт па друку пры Савеце Міністраў БССР, для якіх мы рыхтуем кадры. Зусім неабходна расшырыць і вучэбную плошчу: цяпер на 400 студэнтаў стацыянарнага і вячэрняга навучання ў нас усяго пяць аўдыторый.

Цяпер, напярэдадні 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, супрацоўнікі факультэта прыкладуць усе намаганні для таго, каб значна палепшыць падрыхтоўку работнікаў друку, радыё і тэлебачання. Мы перакананы, што сумесныя намаганні кафедр факультэта, праўлення Саюза журналістаў БССР, рэктарата БДУ, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, рэдакцый газет, радыё і тэлебачання змогуць значна палепшыць падрыхтоўку журналісцкіх кадраў.

Пасля паспяховай здачы выпускных экзаменаў на падрыхтоўчым факультэце нашага універсітэта замежныя студэнты раз'ехаліся ў розныя гарады краіны, каб працягваць вучобу.

Фота Я. ДАНІЛАВА.

НА СЦЭНЕ — ТАЛЕНАВІТАЯ МОЛАДЗЬ

Упершыню ў гэтым навучальным годзе адбылася рэпетыцыя студэнцкіх самадзейных артыстаў фізічнага факультэта. На ёй было выяўлена многа таленавітай моладзі з ліку першакурснікаў ва ўсіх жанрах сцэнічнага мастацтва.

А. АСТАПАВА.

«ПРАМЯТЭЙ» ВЯДЗЕ РАЗМОВУ

На юрыдычным факультэце створаны дыскусійны клуб «Прамятэй». Аматараў прыняць удзел у яго рабоце многа, асабліва сярод першакурснікаў. Абсяг дзейнасці «Прамятэя» вялікі і багаты: членамі клуба будуць праслуханы і прадыскусіраваны лекцыі аб культуры студэнцтва нашай краіны і за мяжой, аб навінках навукі, гутаркі аб міжнародным становішчы. Будзе ўзнята і многа іншых надзённых пытанняў нашага жыцця. Днямі адбудзецца ўрачыстае адкрыццё дыскусійнага клуба «Прамятэй».

І. ШВЕД.



Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТНЫЯ СТАРОНКІ РАСКАЗВАЛІ

7 лістапада спаўняецца 20 год з дня выхаду першага нумара універсітэцкай шматтыражкі, якая і па сённяшні дзень з'яўляецца летапісам жыцця Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Газета на сваіх старонках друкавала матэрыялы на самыя актуальныя пытанні дня—навуковай дзейнасці, вучобы, працы і адпачынку. Яна крочыла ў нагу з сацыялістычным будаўніцтвам, з поспехамі універсітэта.

Ніжэй мы прыводзім факты з газеты, якія сведчаць аб тых ці іншых падзеях пасляваеннага вну, аб яго слаўных людзях.

● **Прысвоена ганаровае званне Заслужанага дзеяча навукі БССР у сувязі з 30-годдзем БССР, за выдатныя заслугі ў развіцці навукі і падрыхтоўцы кадраў у рэспубліцы Ярмоленку Мікалаю Фёдаравічу, правадзейнаму члену АН БССР, прафесару, загадчыку кафедры БДУ.**

(№ 26. 1949 г.).

● **24 чэрвеня ў Вялікай зале Дома ўрада адбылася сустрэча студэнтаў універсітэта з вядомымі паэтамі К. Сіманавым і А. Твардоўскім.**

(№ 114. 1951 г.).

● **Віншаванні з выпадку выхаду 100 нумара нашай газеты прыслалі 14 красавіка 1951 года рэдакцыі рэспубліканскіх, абласных і раённых газет.**

● **Герой «Маладой гвардыі» Жора Аруцюнянц пабываў у гасцях у нашых студэнтаў. Ён расказаў многа цікавага беларускім сябрам аб дзейнасці маладых падпольшчыкаў Краснадона.**

(1 верасня 1955 г.).

● **Сакратар камітэта ЛКСМБ БДУ А. Вашкевіч з'яўляецца членам беларускай дэлегацыі на XI з'езд ВЛКСМ.**

У 9 НУМАРЫ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» за гэты год быў змешчаны артыкул дацэнта факультэта журналістыкі Е. Л. Бондаравай «Што значыць быць культурным?». У ім было паднята шмат жыццятворных праблем культуры студэнта, яго паводзін на лекцыях, дома, на вуліцы, у розных грамадскіх месцах і г. д. Пытанні, узнятыя Е. Л. Бондаравай, выклікалі гарачыя дыскусіі не толькі сярод студэнтаў, але і сярод аспірантаў і выкладчыкаў. Некаторыя водгукі былі надрукаваны ў нашай газеце. Матэрыялам «Твой дом» Ю. Агараднічэнкі мы працягваем пачатую размову.

ТВОЙ ДОМ

Калі ў мяне пытаюць, напрыклад, куды я іду сёння пасля лекцый, я адказваю: дамоў ці ў бібліятэку. Я нават не прыкмячаю, калі з маіх вуснаў вылятае слова «дамоў». Дарэчы ўсе мае сябры таксама гавораць: не ў «інтэрнат», а «дамоў».

Канешне, так можна называць кожны дом, у якім ты жывеш. Але справа ў даным выпадку не ў гэтым. Важна тое, ці добра табе тут жывецца, ці марыш ты аб тым месцы, дзе б табе жылося лепш, дзе было б весялей?

Хочацца прывесці адзін выпадак. У мінулым годзе ў госці да малодшых сябровак прыехала настаўніца рускай мовы і літаратуры Анфіса Канцілавіч, выпускніца філалагічнага факультэта.

— Ой, як у вас весела! — радасна ўсклікнула яна, як толькі пераступіла парог інтэрната. — Я зараз зноў адчула сябе студэнткай. Здаецца, што я на два гады стала маладзей.

Анфіса сказала гэта не таму, што некалі з жалем пакідала інтэрнат. Усяму свой час. Яна любіць сваю прафесію, радуецца таму, што стала настаўніцай. Але толькі цяпер, як ніколі, становіцца зразумелым, наколькі цікавае і змястоўнае жыццё студэнта, якое праведзена ў сценах інтэрната, універсітэта.

Праўда, ёсць людзі, якіх інтэрнат, відаць, не задавальняе. Іх маперы, звычаі ніяк не ўмяшчаюцца ў рамкі звычайных норм студэнцкага жыцця. Так, некаторых не задавальняе рэжым дня, дысцыпліна, якой патрабуюць камендант, студсавет, таварышы. Ці не таму мы і чуем часта апоўначы мелодыі баяна, або голас п'янага спевака. А хіба ж толькі гэта ў інтэрнаце?! І віна ў гэтым не камендантa і не студсавета, а тых, хто сваёй абыякавасцю, маўчаннем патурае парушальнікам дысцыпліны. Праўда, камендант і студсавет надзелены адпаведнымі правамі, але яны чамусьці не заўсёды іх выкарыстоўваюць. Ну, навошта, скажам, трымаць у інтэрнаце тых, хто ператварае свой пакой у нейкую карчму, ці мяздзвежую бярлогу?

У вестыбюлі інтэрната вісіць шыльда, дзе адлюстроўваецца санітарнае становішча студэнцкіх пакояў. Глянем. Пакой № 99 (староста Зуеў) — 5, 2, 2, 2, 4. Гэтыя адзнакі гавораць самі за сябе. А вось пакой № 47 (староста Новікава). Адзнакі — 5, 5, 5, 5, 5... Пакоі ўсе аднолькавыя. Жывуць па шэсць чалавек у кожным. Не прасторна, канешне. Але, як гавораць, мірыцца можна. Дык чаму ж у адным пакоі чысціня, парадак, а ў другім на палец пылу і гразі. Вы скажаце: розныя людзі жывуць у іх. Але ж хіба кожны з шасці студэнтаў пакоя не любіць чысціню? Не. Адзін перад сном чысціць зубы, мые ногі, але курыць у пакоі, другі — старанна прыбірае калідор у час свайго дзяжурства, а свайго ложка прыбраць не хоча, трэці — ва ўсім акуратны, а з іншых не патрабуе гэтага. Што было б, каб усе абыякава глядзелі на ўсё дрэннае, што робіцца ў пакоі, у інтэрнаце?

Суботні вечар. У інтэрнат спяшаецца група маладых людзей, ад якіх нясе спіртным. Ля ўвахода сядзяць дзяўчаты. Не пра[illegible]ціць? Не хоціць [illegible]. Справіцца з такой кампаніяй не так лёгка... Але раптам на дапамогу дзяжурным прыходзіць студэнт юрфака Міхайлаў. Ён — ні член прафкома, ні студсавета. Проста студэнт. Інтэрнат — гэта яго другі родны дом, і ён не можа дапусціць у ім беспарадкаў.

Гэта толькі адзін прыклад. А колькі іх яшчэ можна прывесці з будняў жыцця кожнага універсітэцкага інтэрната!

І ўсё ж хочацца сказаць: нам, усім студэнтам, трэба яшчэ больш удзяляць увагі свайму дому, актыўней [illegible]ца за чысціню [illegible]дак. Я лічу, што большасць парушальнікаў дысцыпліны і распарадку ў інтэрнаце неабходна караць, а не выхоўваць. Пакуль што даволі часта атрымліваецца так: студэнт — дарослы чалавек — зневажае таварышаў, не дае спакойна спаць жыхарам усяго паверха, а мы назаўтра пачынаем угаварваць, каб ён больш так не рабіў. Хіба ж правільна гэта?

Ю. Агараднічэнка.

ШАШЫСТЫ УНІВЕРСІТЭТА — ЧЭМПІЁНЫ РЭСПУБЛІКІ

Бадай, ніколі яшчэ не разгортваліся такія гарачыя баталіі на першынство БССР па рускіх шашках, як у гэтым годзе. Здзіўляцца тут асабліва няма чаго: кожнаму спартсмену ў гэтых цікавых і напружаных спаборніцтвах хацелася стаць чэмпіёнам, завяваць запаветны прыз юбілейнага года.

Каманда ад нашага універсітэта на спаборніцтвах рэспублікі была адной з самых моцных. Як жа праходзілі паядынкі за званне чэмпіёна рэспублікі!

Ужо з першых дзён турніра вялікую ўвагу да сябе прыцягнуў паядынак лідэра спаборніцтваў маладога кандыдата ў майстры Капусцінскага і Бельскага. Падрыхтаваўшы даволі хітра задуманы ўдар, Бельскі паставіў свайго саперніка перад складанымі праблемамі. І праз некалькі хадоў лідэр капітуляваў. Гэтая важная перамога дазволіла Бельскаму пакінуць апошняе месца. Яго калега па месцы, займаемым у турнірнай табліцы, — магілёўскі майстар Красніцкі сустрэўся з гамяльчанінам Дзінарштэйнам і зноў прайграў. Гардзевіч дапусціў перастаноўку хадоў і здаўся віцэбляніну Рыбакову.

Востра і прывабна праходзіла сустрэча аднакурснікаў матэматычнага факультэта нашага універсітэта Беляеўскага і Каца. Перамогу атрымаў юны чэмпіён сталіцы Уладзімір Беляеўскі. Сустрэча мінскіх майстроў Пятровіча і Палянскага закончылася перамогай апошняга.

У цэнтры ўвагі была таксама сустрэча Бержанца і Геллера. Па дэбюту Бержанец атрымаў выдатную пазіцыю і, каб пазбегнуць горшае, прапанаваў нічыю. Геллер адхіліў прапанову саперніка, але неўзабаве сам прапанаваў нічыю. Так працягвалася некалькі разоў, пакуль, нарэшце, нічыя не была прынята. Экс-чэмпіён краіны Плакхін экзаменаваў юнага Пеўзнера. Экзамен быў вытрыман. Нічыя.

Пасля пяці тураў напярадзе аказаўся Беляеўскі. У яго 4 ачкі. Па 3 ачкі набралі Плакхін, Палянскі, Геллер і Капусцінскі, але два апошнія сыграліся на адну партыю менш.

У апошнім туры ўся ўвага была прыкавана да сустрэч: Капусцінскі — Беляеўскі, Кац — Кухарчук. Гэтыя сустрэчы вырашылі лёс першынства. Становішча на адной дошцы дапаўняла разгарачаная барацьба на другой. Вострыя цэйтноты, хітрыя камбінацыі, лавушкі суправаджалі гэтыя сустрэчы. І толькі ў канцы чацвёртай гадзіны гульні вызначыўся чэмпіён. Выкарыстаўшы памылку Капусцінскага, самы юны ўдзельнік чэмпіянату Уладзімір Беляеўскі заваяваў важнае ачко, а з ім і званне чэмпіёна Беларусі. 9,5 ачкоў, 7 перамог, 5 нічыіх і адно паражэнне — такі вынік чэмпіёна, студэнта матэматычнага факультэта нашага універсітэта Уладзіміра Беляеўскага.

Гэты вялікі поспех быў замацаваны яго аднакурснікам майстрам спорту Міхаілам Кацам, які адарваўся ад чэмпіёна толькі на адно ачко. Па 8 ачкоў набралі выпускнік матэматычнага факультэта універсітэта, цяпер інжынер завода імя Арджанікідзе, майстар спорту Якаў Кухарчук і малады рабочы, кандыдат у майстры Міхаіл Капусцінскі. Па табліцы каэфіцыентаў бронза ўручана майстру.

Такім чынам, два першыя месцы ў рэспубліканскіх спаборніцтвах па рускіх шашках у юбілейным годзе Савецкай улады заваявалі студэнты нашага ардэнаноснага БДУ імя У. І. Леніна і трэцяе месца — былы член шашачнага клуба універсітэта Якаў Кухарчук.

Гэтыя поспехі з'яўляюцца яскравым доказам плённай і шматгранай работы кіраўнікоў і членаў шашачнага клуба універсітэта па ўдасканаленню свайго майстэрства. Хочацца ад усяго сэрца пажадаць выдатных поспехаў шашыстам універсітэта і надалей.

Г. ДРАБУШЭВІЧ,
галоўны суддзя спаборніцтваў.

ПЕРШЫЯ ФУТБОЛЬНЫЯ БАТАЛІІ

Добрыя спартыўныя традыцыі падтрымліваюцца і ў гэтым годзе. Футбалісты факультэтаў уключыліся ў гарачыя спаборніцтвы на першынство БДУ. Ужо праведзены тры сустрэчы — хімікаў і матэматыкаў (1:2), геаграфаў і гісторыкаў (6:3), юрыстаў і біёлагаў (2:0). Журналісты, якія павінны былі іграць з фізікамі, на поле не з'явіліся. Ім залічылі паражэнне.

Трэба адзначыць, што пераважная большасць факультэцкіх каманд актыўна прымае ўдзел у гэтых спаборніцтвах. Праўда, не ва ўсіх камандах ёсць свая форма. Таму атрымліваецца так, што нельга адрозніць «сваіх» ад «чужых». Гэта перашкаджае сапраўднай арганізацыі сустрэч. А ў спартсменаў зараз адказны перыяд.

Трэба падрыхтаваць дастойнае папаўненне і ў зборную каманду універсітэта, каб змагацца за першае месца сярод вну рэспублікі замест трэцяга, якое было заваявана ў мінулым годзе. Многае ў гэтым кірунку робіць адказны за спаборніцтвы па футболу старэйшы выкладчык кафедры фізвыхавання універсітэта В. Ліштван.

А. БАБІЧ.



Неўзабаве ў нашым універсітэце пачнуцца спаборніцтва паміж факультэтамі па валейболу. Нядрэнна рыхтуюцца да іх спартсмены філфака, якія ў гэтым годзе маюць усе магчымасці заваяваць прызавое месца.

НАВІЧКІ НА ДЫВАНЕ

Студэнты першага курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта пасля лекцый спяшаюцца ў спартыўныя залы, дзе ў іх будуць праходзіць заняткі па самых розных відах спорта. Адны займаюцца ў секцыі валейболу, другія — у секцыі гімнастыкі, трэція—у лыжнай. Большасць хлопцаў гэтага курса накіроўваецца ў спартыўную залу галоўнага корпуса. Там іх чакае выкладчык па вольнай барацьбе П. М. Фіясь.

Як заўсёды, спачатку размінка. Пасля — дзятальная распрацоўка новага прыёму. І, калі гэты прыём больш-менш засвойваецца, пачынаюцца паядынкі. У іх пакуль яшчэ няма ні вастрыні, ні той хуткасці і ўпэўненасці, якая патрэбна сапраўдным барцам. І толькі судзячы па жаданню ўсё спазнаць, якое ахоплівае юных спартсменаў, можна з упэўненасцю сказаць, што многія з іх у будучым змогуць стаць не толькі разраднікамі, але і майстрамі спорту. А пакуль што—напружаныя трэніроўкі.

К. РАЗАНІЧ.

Зак. 1584 АТ 17618 **Адрас рэд: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, П. 106. тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».** **Рэдактар М. ІОСЬКА.**